деглобализации и регионализации, имеющегося социокультурного контекста и экономического потенциала страны. В контексте Беларуси, можно отметить, что в последние годы базовым принципом стратегии государственной экономической политики все более выступает экономический протекционизм, поддержка отечественных производителей и предпринимателей, а также шаги по развитию евразийской интеграции, ориентация на формирование союзной государственности с Россией как равноправного, партнерского экономического союза государств, разделяющих общие ценности.

*Список литературы*


1. Канашевич, Н. М. Концепт идеологии в модернизирующемся обществе / Н. М. Канашевич ; Министерство внутренних дел Республики Беларусь, Могилевский институт Министерства внутренних дел Республики Беларусь. – Могилев : Могилев. институт МВД, 2019. – 364 с.
2. Стиглиц, Дж. Глобализация: тревожные тенденции [Электронный ресурс] / Дж. Стиглиц ; пер. с англ. Г. Г. Пирогова. – М. : Национальный общественно-научный фонд, 2003. – Режим доступа: http://www.library.fa.ru/files/Stiglitz-global.pdf. – Дата доступа: 03.04.2021
3. Global Connectedness Index // DHL (Official Website) [Electronic resource]. – Mode of access: http://www.dhl.com/en/about_us/logistics_insights/studies_research/global_connectehttp://www.dhl.com/en/about_us/logistics_insights/studies_research/global_connecte dness_index/global_connectedness_index_2012/gci_results.html. – Date of access: 12.03.2021.
4. Рейтинг стран по уровню глобализации KOF [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://nonews.co/directory/lists/countries/globalization-index.– Дата доступа: 12.03.2021.
5. Деглобализация и ее последствия. Главные темы третьего дня форума в Давосе [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://tass.ru/ekonomika/6038757. – Дата доступа: 21.02.2021.
6. Егоров, А. В. Глобальная экономика: смена вех [Электронный ресурс] / А. В. Егоров // Банковское дело. – 2017. – № 8. – Режим доступа: https://popecon.ru/441-deglobalizacija-mirovoi-ekonomiki.html. – Дата доступа: 23.04.2021.


***Канашевич Надежда Михайловна***, Могилёвский институт Министерства внутренних дел Республики Беларусь, г. Могилёв, Республика Беларусь.

**Kanashevich Nadezhda**

Mogilev Institute of the Ministry of Internal Affairs of the Republic of Belarus
e-mail: darya.adigezalova@mail.ru

DEGLOBALIZATION: A NEW TREND OF GLOBALIZATION OR DEVELOPMENT OF REGIONALIZATION

The article emphasizes the importance of studying the applied aspects of the problem of globalization, compares the positions of Belarus according to the results of the two most famous ratings of global integration (GCI; KOF). It is concluded that the condition for maintaining the competitiveness of the state in the modern world is the ability to flexibly adapt to the trends in the world economy, taking into account the complex interweaving of the processes of globalization, de-globalization and regionalization.

*Keywords:* globalization, GCI Global Integration Index, KOF Globalization Index, de-globalization, regionalization, protectionism.

УДК 94:327((47+57)+438)(094.2)«1921»:94:342(476)«1921»

**М. М. Мязга**

## РЫЖСКІ ДАГАВОР ЯК ФАКТАР РАЗВІЦЦЯ САВЕЦКАЙ ФОРМЫ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

Разглядаецца ўплыў Рыжскага дагавора 1921 г. і тых адносін, якія пасля яго падпісання існавалі паміж Савецкай Расіяй / СССР і Польшчай на станаўленне беларускай дзяржаўнасці ў форме БССР. Паказана, што польска-савецкае супрацьстаянне стала адным з важных фактараў, які прымушаў савецкае кіраўніцтва ісці па шляху ўмацавання БССР як беларускай нацыянальнай дзяржавы.

*Ключавыя словы:* БССР, РСФСР, Польшча, Рыжскі мір, Заходняя Беларусь, савецка-польскія адносіны, беларусізацыя, «узбуйненне» БССР.

Польска-савецкая вайна 1919–1920 гг. і завяршыўшы яе мірны дагавор аказалі вялікі ўплыў на працэс фарміравання беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове. Другое абвяшчэнне БССР адбылося ў час, калі, з аднаго боку, Чырвоная армія набліжалася да Варшавы і бальшавіцкія лідары чакалі блізкай саветызацыі Польшчы, а з другога, кіраўніцтва Савецкай Расіі рыхтавалася да пачатку мірных перагавораў з Польшчай. Гэта ў многім тлумачыла палітыку бальшавікоў у адносінах да БССР. У тых умовах, як адзначае беларускі гісторык У. Е. Снапкоўскі, паўторна абвешчаная па ініцыятыве Масквы БССР павінна была выконваць службовую ролю ў знешняй палітыцы РСФСР [1, с. 35]. Як указвалася ў дакладной запісцы ЦБ КП(б)Б у ЦК РКП(б) «Аб тэрыторыі БССР» у красавіку 1923 г., «у перыяд стварэння Савецкай Беларусі пераважную ролю адыгрывалі моманты міжнароднай палітыкі – неабходна было ў процівагу імперыялістычным імкненням Польшчы і жаданням беларускага кулацтва арганізаваць буржуазную Беларускую Рэспубліку пад абаронай Польшчы, супрацьпаставіць Рабоча-Сялянскую Беларусь» [2, с. 191].

Дэкларацыя аб незалежнасці БССР канстатавала раўнапраўны характар адносін паміж ёй і РСФСР. Але з другога боку заяўлялася аб перадачы Беларускай Рэспублікай «на ўвесь час рэвалюцыйных войнаў» сваіх узброеных сіл у распараджэнне РСФСР і выяўлялася гатоўнасць узгадняць дыпламатычныя выступленні

рэспублікі з дзеяннямі РСФСР [3, с. 186]. Пры гэтым бальшавікі не мелі наўвазе ўключэнне ў склад БССР усіх беларускіх этнічных тэрыторый. Выступаючы на IX канферэнцыі РКП(б) 22 верасня 1920 г., У. Ленін заявіў, што правядзенне лініі фронта па Бярэзіне прывяло б да таго, што палякі атрымалі б усю Беларусь [4, с. 98]. Такім чынам, землі на ўсход ад Бярэзіны ён не прызнаваў этнічна беларускімі. Гарантый таго, што БССР другога абвяшчэння не напаткае лёс БССР першага абвяшчэння, не было.

З пачаткам мірных перагавораў з Польшчай у жніўні 1920 г. БССР аказалася патрэбнай бальшавікам як элемент у дыпламатычнай гульні з палякамі, каб прадстаўляць яе як факт рэалізацыі беларусамі права на самавызначэнне і супрацьдзейнічаць тым самым польскім планам «буферызму». БССР таксама патрэбна была Маскве як альтэрнатыва БНР. 14 верасня 1920 г. Г. Чычэрын пісаў І. Смілгу, што з прычыны актыўнасці ўрада Ластоўскага неабходна паскорыць прыезд беларускага савецкага прадстаўніка ў Рыгу, каб супрацьпаставіць яго ўраду БНР [5, с. 158]. 16 верасня ў лісце кіраўніку савецкай дэлегацыі ў Рызе А. Іофе Г. Чычэрын зноў адзначыў неабходнасць паскорыць прыезд Ігнатоўскага ў Рыгу на той выпадак, калі, магчыма, польскі бок паставіць пытанне аб прызнанні незалежнасці Беларусі. Тады можна было б прадставіць Савецкую Беларусь як ужо існуючую незалежную беларускую дзяржаву [6, с. 204]. Пры гэтым Г. Чычэрына вельмі цікавіла наяўнасць рашэння рэўкама БССР, якое ўпаўнаважвала Савецкую Расію ўстанавіць граніцу Беларусі. Адпаведную паперу, па яго словах, трэба было прад'явіць польскай дэлегацыі, але не дапускаць А. Чарвякова да перамоў [5, с. 163]. На тое, каб прадставіць БССР як факт рэалізацыі беларусамі права на самавызначэнне, нацэлена і палажэнне заявы ЦВК РСФСР ад 23 верасня 1920 г., у якім адзначалася, што Савецкая Расія яшчэ ў 1918 г. прызнала незалежнасць і суверэннасць Украіны і Беларусі [7, с. 205]. На сустрэчы з кіраўніком польскай дэлегацыі ў Рызе Я. Донбскім 1 кастрычніка А. Іофе заявіў, што беларускі народ ужо самавызначыўся на савецкай аснове, і прапанаваў абмежавацца формулай двухбаковага прызнання БССР, што і было прынята польскім бокам [6, с. 165].

Вырашэнне пытання аб прадстаўніцтве БССР на перагаворах у Рызе сведчыць пра няўстойлівасць савецкай формы беларускай дзяржаўнасці ў той момант. Вышэй ужо адзначалася, што Г. Чычэрын надаваў важнае значэнне наяўнасці дакумента, які даваў бы РСФСР права весці перамовы і падпісаць мірны дагавор з Польшчай і ад імя БССР. Менавіта такое рашэнне было прынята ВРК БССР 10 верасня. Але 16 верасня той жа орган прыняў рашэнне, у якім гаварылася, што А. Чарвякоў – упаўнаважаны прадстаўнік ВРК БССР, які з'яўляецца ў дадзены час адзіным урадам Рэспублікі Беларусь. А. Чарвякоў атрымаў паўнамоцтвы заключаць з дэлегацыяй Польшчы дагаворы аб перамір'і і міры, абмене ваеннапалонных, цывільных асоб і закладнікаў, устанаўленні меж і гандлёвых адносін паміж БССР і Польскай Рэспублікай. Беларускі гісторык В. М. Бароўская робіць абгрунтаваную выснову, што фактычна ВРК БССР выдаў два мандаты на вядзенне перагавораў. Гэта давала магчымасць разглядаць беларускае пытанне з розных бакоў у залежнасці ад пазіцыі польскай дэлегацыі. Польскі ж бок пагадзіўся на патрабаванне РСФСР аб самастойным ўдзеле ў перагаворах украінскай дэлегацыі, але выступіў рашуча супраць такога ўдзелу БССР [6, с. 155]. Уплыў на пазіцыю кіраўніцтва Савецкай Расіі па беларускаму пытанню падчас мірных перагавораў з Польшчай аказвала і тое, што яно не было ўпэўнена ў трываласці савецкай ўлады на тэрыторыі Беларусі. Калі польская дэлегацыя 1 кастрычніка заявіла, што Польшча можа або згадзіцца на стварэнне на сваіх усходніх межах буферных дзяржаў, або правесці граніцу такім чынам, каб чыгунка Ліда – Баранавічы – Лунінец – Роўна – Броды была ўключана ў склад Польшчы, савецкі бок выбраў другі варыянт. Прычыну такога рашэння можна знайсці ў лісце Г. Чычэрына У. Леніну ад 25 жніўня 1920 г. Наркам замежных спраў даказваў немагчымасць для РСФСР выступіць з прапановай аб вывадзе ўсіх савецкіх войск з Беларусі і Украіны, бо становішча бальшавікоў на гэтых тэрыторыях няўстойлівае і ёсць рызыка страціць уладу [8, с. 4–5].

Пасля падпісання прэлімінарнага міру расійскае кіраўніцтва лічыла неабходным захаванне БССР як фармальна самастойнай рэспублікі. 3 лістапада 1920 г. Г. Чычэрын пісаў у Палітбюро: «Неабходна, аднак, падкрэсліваць, што як Украіна, так і Беларусь не ўваходзяць у склад РСФСР. Для барацьбы супраць польскага буферызму гэтую сістэму трэба праводзіць з найвялікшай паслядоўнасцю». У гэтым духу быў вытрыманы Дагавор аб ваенным і гаспадарчым саюзе паміж РСФСР і БССР ад 16 студзеня 1921 г. [3, с. 214, 243]. Аднаўленне апасенняў бальшавікоў адносна польскай палітыкі буферызму па часе супала з паходам Балаховіча на беларускае Палессе. У бальшавікоў у той момант па-ранейшаму не было ўпэўненасці ў трываласці свайго становішча на Беларусі. Гэта праявілася пры абмеркаванні пытання аб павелічэнні тэрыторыі БССР. Г. Чычэрын выступіў супраць гэтага. 6 лістапада 1920 г. ён пісаў сакратару ЦК РКП(б) М. Крэсцінскаму: «Калегія Нарказамспраў знаходзіць непажаданым далучэнне да тэрыторыі Беларусі якіх-небудзь частак Віцебскай або Магілёўскай губерняў. Мы яшчэ не ведаем, праз якія перыпетыі можа прайсці лёс Беларусі, і павялічыць загадзя тую тэрыторыю, якая праз гэтыя перыпетыі будзе праходзіць, было б вельмі неасцярожна». 11 лістапада на пасяджэнні ЦБ КП(б)Б А. Чарвякоў заявіў: «Насельніцтва не церпіць палякаў, але і асаблівай любові не адчувае да камуністаў» [2, с. 139, 140]. У такой сітуацыі бальшавікі працягвалі адхіляць магчымасць удзелу БССР у рыжскіх перагаворах. 13 снежня ў гутарцы з В. Кнорыным Г. Чычэрын зазначыў, што БССР не магла выступаць на перагаворах як чацвёрты ўдзельнік (разам з РСФСР, УССР і Польшчай), бо яе дзяржаўнае жыццё яшчэ не

было афармлена належным чынам. Расійскі наркам зноў нагадаў аб паўнамоцтвах, дадзеных беларускім рэўкамам ураду РСФСР [5, с. 249]. 30 снежня Г. Чычэрын пісаў у Палітбюро, што ўдзел БССР у перагаворах непажаданы, бо ён мог парушыць дасягнутые на іх камбінацыі. Звязвалася такая магчымасць з ростам нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, іх незадавальненнем у сувязі з намячаўшымся падзелам Беларусі [3, с. 240].

18 сакавіка 1921 г. у Рызе быў падпісаны мірны дагавор паміж РСФСР і УССР з аднаго боку і Польшчай – з другога. У прэамбуле адзначалася, што ўрад РСФСР падпісвае дагавор «за сябе і па ўпаўнаважанні Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі». У арт. 2 дагавора гаварылася, што бакі «паводле прынцыпу самавызначэння народаў, прызнаюць незалежнасць Украіны і Беларусі». Далей гаварылася пра ўсходнюю мяжу Польшчы з Расіяй, Беларуссю і Украінай. Тым самым прызнавалася дзяржаўная граніца БССР на заходнім напрамку. Баларусь фігурыравала і ў арт. 3, паводле якога Польшча адмаўлялася на карысць Украіны і Беларусі ад усялякіх праў і дамаганняў на землі, што размяшчаліся на ўсход ад усталяванай граніцы [7, с. 618–619]. Гэтыя палажэнні Рыжскага дагавора азначалі, што БССР фармальна набывала статус суб’екта міжнародных адносін. Важным для ўмацавання савецкай формы беларускай дзяржаўнасці было і палажэнне Рыжскага дагавора, якое прадугледжвала ўстанаўленне дыпламатычных адносін паміж РСФСР, УССР і БССР, з аднаго боку, і Польшай – з другога [9, с. 542–543].

Пасля заключэння Рыжскага дагавора польска-савецкае супрацьстаянне працягвалася, і гэта ўплывала на лёс БССР. Як адзначае польскі гісторык П. Ставецкі, стварэнне Беларусі з Мінскам як сталіцай павінна было ў будучым стаць апорай супраць Польшчы. А «крэсавая» палітыка аддаліла беларускае насельніцтва ад Польшчы, якое да гэтага да яе цягацела [10, s. 114–115]. 4 лістапада 1920 г. на нарадзе польскіх чыноўнікаў у Вільні было выпрацавана цвёрдае перакананне, што Беларусь існуе толькі за межамі польскай дзяржавы. [4, с. 129]. Фактычна гэта азначала, што ініцыятыва ў вырашэнні беларускага пытання пераходзіць у рукі кіраўніцтва РСФСР.

Ва ўмовах супрацьстаяння з Польшчай Масква пачала ўносіць карэктывы ў сваю палітыку ў дачыненні да БССР. У аснове новай палітыкі была ідэя надання трываласці БССР як увасабленню беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. На думку расійскага гісторыка Ю. А. Барысёнка ініцыятарамі такой палітыкі выступалі І. Сталін і Г. Чычэрын. Яны яшчэ з канца 1920 г. прапаноўвалі надаць беларускі характар БССР [4, с. 98, 99]. Неабходнасць новай палітыкі ў справе савецкай формы беларускай дзяржаўнасці тлумачылася супрацьстаяннем з Польшчай. У лісце Г. Чычэрына ў ЦК РКП(б) ад 30 снежня 1920 г. адзначалася: «Мы павінны ісці насустрач самастойнай плыні ў Беларусі, бо ў адваротным выпадку іншыя ёю авалодаюць» [5, с. 258]. У тагачаснай сітуацыі «іншымі», хто мог паставіць пад свой кантроль беларускі нацыянальны рух, былі польскія палітычныя колы. Названыя вышэй абставіны далі штуршок працэсу надання нацыянальнага характару беларускай савецкай дзяржаўнасці. Кіраўніцтва БССР разумела, што ва ўмовах пасля Рыжскага дагавора ў кантэксце польска-савецкіх адносін важна дэманстраваць ўдзел Савецкай Беларусі ў міжнародным жыцці. 30 жніўня 1921 г. у лісце Г. Чычэрыну намеснік наркама замежных спраў БССР А. Бурбіс выказваў пажаданне, каб змешаныя камісіі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі БССР у адпаведнасці з Рыжскім дагаворам, працавалі ў цесным кантакце з НКЗС рэспублікі. Па словах А. Бурбіса, гэта паказала б палякам, што БССР не з’яўляецца фікцыяй і дапамагло б уздыму прэстыжу савецкай улады ў Беларусі [3, с. 283]. Было прынята рашэнне аб уключэнні прадстаўніка БССР у склад Змешанай пагранічнай камісіі, але яно не было рэалізавана на практыцы [11, s. 299].

Сведчаннем пераходу Масквы да новай палітыкі па беларускаму пытанню стала выступленне І. Сталіна на X з’ездзе РКП(б). Ён адверг тэзіс аб тым, што камуністы штучна насаджаюць беларускую нацыянальнасць, і заявіў аб існаванні самастойнага беларускага народа і яго мовы [12, с. 611]. Знешнепалітычны фактар аказаў уплыў і на прыняцце рашэння аб правядзенні палітыкі беларусізацыі. Штуршок да яе пачатку дала дзейнасць камісіі Молатава па рабоце сярод беларусаў, створанай Палітбюро 31 мая 1923 г. 7 ліпеня на пасяджэнні камісіі ў прысутнасці А. Чарвякова і В. Багуцкага былі падведзены вынікі яе дзейнасці. Першы пункт рашэнняў камісіі «аб школах» прадугледжваў задавальненне «патрэб мясцовага насельніцтва ў пастаноўцы школьнай справы на родных мовах, у прыватнасці, на беларускай». Другім пунктам было прынята рашэнне «прызнаць неабходным пашырэнне граніц Беларусі і ўзбуйненне тэрыторыі Беларускай Рэспублікі». ЦБ КП(б)Б Беларусі ў двухтыднёвы тэрмін павінна было прадставіць свае прапановы «аб умацаванні Беларускай Рэспублікі ў ЦК РКП(б)» [4, с. 131, 137–138].

Узнікненне камісіі Молатава і яе праца былі непасрэдна звязаны са знешняй палітыкай СССР. 29 мая 1923 г. намеснік Г. Чычэрына Я. Ганецкі накіраваў ліст І. Сталіну. Ён пісаў пра неабходнасць выкарыстоўваць у інтарэсах савецкай знешняй палітыкі ўсе элементы, якія могуць спрыяць разлажэнню польскай дзяржавы. Да такіх элементаў, на яго думку, належалі і беларусы, якія, «дзякуючы крайне недальнабачнай палітыцы польскіх пануючых класаў <…> падвяргаюцца прыцясненням і праследаванням, якія штурхаюць нават самых памяркоўных з іх у шэрагі адкрытай апазіцыі». У выніку назіраецца сярод «усіх пластоў беларускага насельніцтва ў Польшчы пэўнае цягаценне і арыентацыя ў бок Савецкай Беларускай Рэспублікі, якая павінна з’явіцца аб’яднальным цэнтрам для ўсіх зямель беларускіх». Далей Я. Ганецкі паведамляў, што паўпрад у Варшаве Л. Абаленскі прапанаваў правесці наступныя мерапрыемствы, якія маглі б паўплываць на настроі беларусаў у Польшчы на карысць БССР: амністыя для ўдзельнікаў беларускага нацыянальнага руху, дазвол ім вярнуцца ў БССР і займацца культурнай работай; перавод школ на беларускую мову выкладання; пашырэнне граніц БССР праз уключэнне ў яе склад этнічных беларускіх зямель, якія ў той час уваходзілі ў склад РСФСР.

Пры гэтым калегія НКЗС палічыла патрэбным прыняць з прапаноў Л. Абаленскага толькі пункты аб амністыі і школах [4, с. 133–134].

Польшча таксама прадпрымала крокі, якія павышалі статус БССР як незалежнай дзяржавы. Так, польскі бок дэманстраваў гатоўнасць да наладжвання з БССР прамых дыпламатычных стасункаў, як гэта было прадугледжана Рыжскім дагаворам. 13 жніўня 1921 г. адбылася гутарка польскага паверанага ў справах у РСФСР Т. Філіповіча з прадстаўніком БССР у Маскве М. Марозам. Беларускі дыпламат падтрымаў польскую ініцыятыву аб абмене дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі паміж БССР і Польшчай і паведаміў аб гэтым у Мінск. Аднак НКЗС РСФСР выказаўся супраць абмену дыпламатычнымі місіямі паміж БССР і Польшчай, матывуючы гэта тым, што непажадана стварэнне новых польскіх дыпламатычных пляцовак на тэрыторыі савецкіх рэспублік. Не прынеслі станоўчага выніку перамовы паміж А. Чарвяковым і начальнікам усходняга аддзела польскага МЗС М. Шымлакоўскім і кантакты з прадстаўнікамі БССР члена Змешанай пагранічнай камісіі ад Польшчы Я. Кліма ў 1922 г. [13, s. 105–166, 108]. Негатыўная пазіцыя Масквы адносна прамых польска-беларускіх кантактаў тлумачылася апасеннямі, што Польшча тым самым імкнецца аслабіць расійскі ўплыў на БССР.

Інтарэсы палітыкі Савецкай Расіі на польскім напрамку патрабавалі ад яе крокаў, якія дэманстравалі б дзяржаўную незалежнасць БССР. Гэта праявілася, у прыватнасці, у ўдзеле Савецкай Беларусі ў падпісанні некаторых міжнародных дакументаў. 21 жніўня 1921 г. БССР стала ўдзельнікам пратакола аб пагаджальных камісіях па ліквідацыі пагранічных інцыдэнтаў, 24 студзеня 1922 г. быў падпісаны расійска-украінска-беларуска-польскі дадатковы пратакол аб урэгуляванні пагранічных спрэчак [3, с. 262, 298]. 7 лютага 1923 г. БССР стала адным з падпісантаў санітарнай канвенцыі з Польшчай [14, с. 215–216]. Падпісанне БССР гэтых дакументаў не сведчыць аб яе самастойнай ролі ў міжнародных справах. Гэта былі сімвалічныя акцыі, якія патрабаваліся Маскве, каб дэманстраваць існаванне беларускай нацыянальнай дзяржавы ў выглядзе БССР як цэнтра прыцягнення для Заходняй Беларусі.

На тое, каб зрабіць БССР больш прывабнай для насельніцтва Заходняй Беларусі, было нацэлена і вяртанне ў яе склад усходніх этнічных беларускіх тэрыторый. Кіраўніцтва БССР, каб дабіцца гэтага, прыводзіла аргументы, звязаныя з міжнародным становішчам. У запісцы НКЗС БССР ад 15 верасня 1922 г. гаварылася: «Паколькі Беларусь будзе прадстаўляць з сябе дзяржаву, якая па свайму геаграфічнаму і палітычнаму значэнню можа быць супрацьпастаўлена такім дзяржавам, як Літва, Латвія ці Польшча, пастольскі яна з'яўляецца ў той жа час магутным прыцягальным цэнтрам для замежнай Беларусі» [3, с. 324]. Ідэя аб міжнародным значэнні «ўзбуйнення» БССР утрымліваецца і ў дакладной запісцы ЦБ КП(б)Б «Аб тэрыторыі БССР» у красавіку 1923 г. [15, с. 32].

Вышэй ужо адзначалася, што камісія Молатава прызнала мэтазгодным павелічэнне тэрыторыі БССР. 12 ліпеня 1923 г. Палітбюро адобрыла рашэнне камісіі Молатава аб павелічэнні тэрыторыі БССР [16]. Першапачатковая прапанова беларускіх улад аб уключэнні ў склад БССР Віцебскай і Гомельскай губерній цалкам, а таксама Горацкага і Мсціслаўскага паветаў Смаленскай губерні была скарэктаваны. Навазыбкаўскі, Почапскі, Суражскі, Мглінскі і Старадубскі паветы Гомельскай губерні далучаліся да Бранскай губерні [4, с. 124]. Палітбюро абавязала Прэзідыум ЦВК СССР аформіць названае рашэнне ў савецкім парадку. Пры разглядзе гэтага пытання ЦВК выказаўся за тое, каб Себежскі, Невельскі, Веліжскі, Гомельскі і Рэчыцкі паветы пакінуць у складзе РСФСР, як і частку валасцей Мсціслаўскага павета. 29 снежня Палітбюро пагадзілася з такім рашэннем [17]. Прадстаўнікі БССР А. Чарвякоў і В. Багуцкі агучылі адмысловы пункт гледжання, які быў адлюстраваны ў пратаколе. Як лічыць Ю. А. Барысёнак, гэта фармальна давала падставы беларусам яшчэ раз паставіць пытанне аб спрэчных тэрыторыях [4, с. 125].

Савецкае кіраўніцтва імкнулася акцыі па павелічэнні тэрыторыі БССР надаць міжнародны рэзананс, перш за ўсё ў Польшчы. 7 жніўня 1923 г. член калегіі НКЗС В. Коп накіраваў тэлеграму Л. Абаленскаму, у якой указвалася, што «ў Польшчы дзіўным чынам прайшло зусім незаўважаным наша рашэнне пашырыць граніцы Баларусі на ўсход». Паўпрэду даручалася «лансіраваць» гэтае пытанне сярод польскай грамадскасці. Пры гэтым ён павінен быў «супрацьпастаўляць вызваленчую палітыку Саюза палітыцы прыгнечання нацыянальнасцей у Польшчы» [18, л. 23–24]. Зацікаўленасць Масквы ў рэакцыі за мяжой на «ўзбуйненне» БССР захавалася і пасля таго, як яно стала фактам. У сакавіку 1924 г. Л. Абаленскі даваў адказ на запыт НКЗС і канстатаваў, што польская прэса цалкам ігнаравала факт павелічэння тэрыторыі Беларусі [19, л. 4].

Такія напрамкі палітыкі Масквы ў дачыненні да БССР, як беларусізацыя, «узбуйненне» павінны былі, на думку савецкіх кіраўнікоў, выклікаць на тэрыторыі Заходняй Беларусі цэнтраімклівыя тэндэнцыі, што дазволіла б падвергнуць рэвізіі рыжскую граніцу. Да гэтага імкнулася савецкая палітыка. У заўвагах да рэзалюцыі V Кангрэса Камінтэрна па нацыянальнаму і каланіяльнаму пытанню ў 1924 г. І. Сталін прапанаваў весці гаворку аб «уз'яднанні разарваных на часткі імперыялістычнымі дзяржавамі Украіны і Беларусі» і падкрэсліў, што «гэтыя разарваныя часткі самкнуцца з СССР» [20, с. 270–271]. Кангрэс адобрыў лозунг кампартыі Польшчы аб аб'яднанні беларускіх этнічных тэрыторый у «Савецкую рабоча-сялянскую рэспубліку» [21, с. 211]. Адносна планаў СССР перагледзець польскую граніцу паказальна заява І. Сталіна на XIV з'ездзе УКП(б) у 1925 г. Ён адзначыў, што Версальскі дагавор узаконіў, акрамя іншага, «страту ўкраінскай Галіцыі і Заходняй Валыні, страту Беларуссю заходняй яе часткі, страту Літвой Вільні і іншае» [22, с. 14]. З гэтага выказвання напрошваецца выснова аб справядлівасці далучэння Заходняй Беларусі да БССР.

Пры прыняцці рашэння аб другім «узбуйненні» БССР праблема адносін з Польшчай таксама мела важнае значэнне. У лісце сакратара ЦК КП(б)Б А. Крыніцкага ў камісію Палітбюро па пытанні пашырэння граніц БССР ад 14 жніўня 1926 г. адзначалася, што асноўны рашаючы аргумент за пашырэнне граніц БССР у бліжэйшы час вызначаецца палітыкай Польшчы.

Выказвалася апасенне, што рэформы, якія ў адносінах да нацыянальных меншасцей плануе правесці Ю. Пілсудскі, атрымаюць падтрымку з боку правых беларускіх арганізацый і «вагаючыхся элементаў» у Польшчы. Адзначалася, што частка інтэлігенцыі нават у БССР пачынае вагацца і бачыць у палітыцы Ю. Пілсудскага шлях да рашэння беларускага пытання [15, с. 220]. Тая ж ідэя аб неабходнасці далучэння да БССР Гомельшчыны, каб супрацьстаяць палітыцы Пілсудскага па перацягванні на свой бок беларусаў у Польшчы, утрымліваецца ў лісце ЦК КП(б) Беларусі ў ЦК УКП(б) «Аб пашырэнні граніц БССР» ад 11 верасня 1926 г. [15, с. 236].

Пазіцыю беларускага кіраўніцтва падтрымала калегія НКЗС СССР, якая 8 верасня 1926 г. прыняла рашэнне «настойваць у Палітбюро, каб два паветы (Гомельскі і Рэчыцкі), у якіх маецца несумнеўная беларуская большасць, неадкладна далучыць да БССР» [15, с. 231]. 18 лістапада Палітбюро прыняло рашэнне аб далучэнні Гомельскага і Рэчыцкага паветаў да Савецкай Беларусі [23].

Такім чынам, ва ўмовах падрыхтоўкі мірнага дагавора з Польшчай, і пасля, калі Рыжскі дагавор стаў фактам, склаліся абставіны, калі бальшавікі былі зацікаўлены ў існаванні савецкай формы беларускай дзяржаўнасці. БССР аказалася патрэбнай ім для вырашэння сваіх знешнепалітычных задач на польскім напрамку. Гэта, побач з ростам нацыянальнай свядомасці беларусаў, з чым мусіла лічыцца Масква, аказалася фактарам, які садзейнічаў станаўленню і развіццю беларускай савецкай дзяржаўнасці. Знешнепалітычная мэтазгоднасць стала важным аргументам для правядзення палітыкі беларусізацыі і вяртання ў склад БССР усходніх беларускіх тэрыторый у 1924 і 1926 гг.

*Спіс літаратуры*


1. Снапкоўскі, У. Е. Шлях скрозь стагоддзе: беларуска-польскія адносіны (1918–2017 гг.) / У. Е. Снапкоўскі. – Мінск : БДУ, 2017. – 287 с.
2. Государственные границы Беларуси : сб. док. и материалов : в 2 т. / сост.: В. Е. Снапковский [и др.]. – Минск : БГУ, 2012. – Т. 1 : (март 1917 – ноябрь 1926). – 495 с.
3. Знешняя палітыка Беларусі : зб. дак. і матэрыялаў : у 10 т. – Мінск : БелНДІДАС, 1997. – Т. 1 : 1917–1922 гг. – 398 с.
4. Борисёнок, Ю. А. На крутых поворотах белорусской истории: Общество и государство между Польшей и Россией в первой половине XX века / Ю. А. Борисёнок. – М. : ООО «Родина МЕДИА», 2013. – 352 с.
5. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.) : зб. дак. і матэрыялаў : у 4 т. – Мінск : ЮНІПАК, 2008. – Т. 1, ч. 2. – 394 с.
6. Бароўская, В. М. Беларускае пытанне на савецка-польскіх перагаворах 1918–1921 гг. / В. М. Бароўская. – Мінск : Беларуская навука, 2017. – 269 с.
7. Документы внешней политики СССР : в 24 т. – М. : Госполитиздат, 1959. – Т. 3. – 723 с.
8. Польско-советская война 1919–1920. (Ранее не опубликованные документы) : в 2 ч. – М. : Институт славяноведения и балканистики, 1994. – Ч. 2. – 236 с.
9. Документы внешней политики СССР : в 24 т. – М. : Госполитиздат, 1961. – Т. 4. – 807 с.
10. Stawecki, P. Ratyfikacja umowy preliminaryjnej i Traktatu ryskiego przez sejm ustawodawczy / P. Stawecki // Traktat ryski 1921 roku po 75 latach : studia / pod red. M. Wojciehowskiego. – Toruń : Wyd. Uniwersytetu Mikolaja Kopernika, 1998. – S. 111–123.
11. Snapkouski, U. Białoruś Soweiecka a kwestia przestzegania postanowień traktatu ryskiego / U. Snapkouski // Polacy na Bialorrusi. Od Powstania Styczniowego do początku XXI wieku / pod red. T. Gawina. – Warszawa : Uniwersytet Warszawski, 2020. – T. IV : Rok 20 na tle przełomów politycznych XX wieku. – S. 293–314.
12. Десятый съезд РКП(б) : стенографический отчет. – М. : Госполитиздат, 1963. – 916 с.
13. Materski, W. Druga Rzeczpospolita wobec problem stosunków dyplomatycznych z Białorusią / W. Materski // Stosunki polsko-białoruskie: historia i współczesność / red. D. Michaluk. – Kraków : Wydawnictwo AVALON, 2013. – S. 91–108.
14. Документы и материалы по истории советско-польских отношений : в 14 т. – М.: Наука, 1966. – Т. 4. – 559 с.
15. Знешняя палітыка Беларусі : зб. дак. і матэрыялаў : у 10 т. – Мінск : БелНДІДАС, 1999. – Т. 2 : 1923–1927 гг.. – 461 с.
16. Пратакол пасяджэння Палітбюро № 16 ад 12 ліп. 1923 г. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://sovdoc.rusarchives.ru/#showunit&id=14903;tab=img. – Дата доступу: 10.12.2020.
17. Пратакол пасяджэння Палітбюро № 58 ад 29 декабря 1923 г. [Электронны рэсурс] – Рэжым доступу: http://sovdoc.rusarchives.ru/#showunit&id=14945;tab=img. – Дата доступу: 18.11.2020.
18. Архіў знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі. – Ф. 04. Оп. 32. Д. 212. Д. 52565.
19. Архіў знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі. – Ф. 04. Оп. 32. П. 213. Д. 52596. Т. 2.
20. Политбюро ЦК РКП(б) – ВКП(б) и Коминтерн. Решения «особой папки». 1919–1943. – М. : Российская политическая энциклопедия (РОССПЭН), 2004. – 960 с.
21. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.) : зб. дак. і матэрыялаў : у 4 т. – Мінск : ЮНІПАК, 2012. – Т. 2. – 480 с.
22. Четырнадцатый съезд ВКП(б) : стенографический отчет. – М. : Госполитиздат, 1926. – 789 с.
23. Пратакол пасяджэння Палітбюро № 68 ад 18 ліст. 1926 г. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://sovdoc.rusarchives.ru/#showunit&id=68967;tab=img. – Дата доступу: 18.11.2020.


***Мязга Мікалай Мікалаевіч***, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны, г. Гомель, Рэспубліка Беларусь.

**Miazga Mikalai**
Francisk Skorina Gomel State University
e-mail: miazgamm65@gmail.com

THE RIGA TREATY AS A FACTOR OF STRENGTHENING THE SOVIET FORM OF BELARUSIAN STATEHOOD

The article examines the influence of the Riga Treaty of 1921 and the relations that existed between Soviet Russia / USSR and Poland after its signing on the formation of the Belarusian statehood in the form of the BSSR. It is shown that the Polish-Soviet confrontation was one of the important factors that forced the Soviet leadership to follow the path of strengthening the BSSR as a Belarusian national state.
*Keywords:* BSSR, RSFSR, Poland, Riga Peace, Western Belarus, Soviet-Polish relations, Belorussization, «enlargement» of the BSSR.

УДК 327.8

**С. П. Рамазанов, Д. В. Гарбузов**

## ФОРМИРОВАНИЕ НОВОЙ МОДЕЛИ ГЛОБАЛИЗАЦИИ И МЕСТО РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ В СОВРЕМЕННОЙ СИСТЕМЕ ГЕОПОЛИТИКИ

Статья посвящена исторической драматургии реализации политики глобализма и формирования современной системы геополитики. Рассматриваются особенности и феноменология советского и западного (американского) глобализма, а также смена моделей глобализации, происходящая в настоящее время. Осуществляется анализ геополитических альтернатив, возможных для Республики Беларусь.
*Ключевые слова:* глобализация, советский глобализм, американский глобализм, цензовая модель глобализации, современная система геополитики, Республика Беларусь.

Стремление к глобализации мирового исторического процесса проявилось уже в древнем мире – в попытке Александра Македонского соединить Запад и Восток, в объединении Древним Римом мирового (в представлении людей II в. до н. э.) пространства. Именно такое объединение, по убеждению древнегреческого историка Полибия, положило начало «Всеобщей истории», так же он назвал свою знаменитую книгу [3]. Но действительные предпосылки для реализации идеи глобализма в мировом пространстве в области хозяйства, культуры, политики, идеологии сформируются только в эпоху европейского модерна после завершения промышленной революции [1, с. 113–128]. При этом, если на практике европейские страны долгое время были заняты экономическим, политическим и территориальным разделом мира, то в противоположность буржуазному миру в коммунистическом движении возникает именно глобалистская идея, связанная с перспективой всеобщего объединения посредством мировой социалистической революции, первоначально возможной в группе самых передовых государств.

На практике идея глобализма реализовалась в большей степени в Советском Союзе в рамках приоритета пролетарского интернационализма. И только после Второй мировой войны набирает силу идея американского глобализма. Можно сказать, что большая часть второй половины XX в. прошла под знаком противопоставления двух глобализмов – коммунистически-большевистского и американского. Коммунистически-интернациональная и американская модели глобализма расходились в декларации своих идей об основе достижения человеческого счастья. Такой основой объявлялась, с одной стороны, справедливость в организации процессов производства и распределения, а с другой стороны, – соблюдения демократии и прав человека. Однако в методологии реализации своих идей оба варианта глобализма были весьма близки. Оба варианта глобализма стремились к распространению своего влияния на другие страны в экономической, идеологической и политической сферах. СССР оказывал материальную поддержку коммунистическому и рабочему движению во многих странах после Второй мировой войны. Осуществлял экономическую помощь странам Восточной Европы, государствам так называемой социалистической ориентации в Азии, Африке, Латинской Америке. США еще до Второй мировой войны провозгласили свою монополию на страны Латинской Америки и после войны реализовали экономическую помощь и подчинили себе Западную Европу.

Оба варианта глобализма получили широкое обоснование и распространение. С одной стороны, через марксистско-ленинскую политическую литературу, социалистический реализм в вербальном и визуальном искусстве, с другой стороны, через пропаганду американского образа жизни посредством различных образовательных программ, активную работу радиостанций, массированное насаждение американского кинематографа и популярной музыкальной культуры. Подозреваемые в таком грехе как инакомыслие в обоих системах подвергались гонениям. В СССР широко развернулись ленинско-сталинские репрессии, в США они имели место во времена маккартизма. И в той, и в другой системах появился феномен диссидентства среди деятелей культуры, образования, науки журналистики. В СССР был закрыт въезд в страну А. Солженицыну, Ю. Любимову. В США – Ч. Чаплину. Активизировались попытки военно-силового подчинения независимых государств. СССР вторгался в Венгрию в 1956 г., в Чехословакию в 1968 г., в Афганистан в 1979 г. США развязывали войны во Вьетнаме в 1960-е гг., в Ираке в 1990-е и последующие годы, в Югославии в 1999 г., в Афганистане в 2001 г. Можно отметить, что степень внутренних репрессий в интернационал-коммунистическом